Таким образом, политическая задача в отношении нынешней оппозиции главой исполнительной власти сформулирована абсолютно недвусмысленно. Ее необходимо, так сказать, безотлагательно вывести в тираж, а освободившуюся нишу наполнить "конструктивными" элементами. Откуда их взять? Да хотя бы из числа новобранцев Палаты представителей. Вполне возможно, на эту роль уже подобраны или даже назначены соответствующие кадры. Они начнут с парламентской критики некоторых второстепенных шагов власти, публично обозначат свою особую позицию, которая не будет альтернативой официальному курсу, но послужит его "усовершенствованию"… Затем носители особой позиции собьются во фракцию или что-то вроде партии, общественного движения, потребуют, чтобы Запад усматривал в их деятельности некое оппозиционное содержание. Западные политики, уставшие от многолетнего бодания с белорусским режимом и безрезультатных ставок на старую оппозицию, возможно, не сразу, но, скорее всего, внемлют такого рода требованиям. И пойдет-поедет…

Сопредседатель политсовета Объединенных демократических сил, лидер ОГП Анатолий Лебедько, оценивая итоги парламентских выборов, высказался в том духе, что отсутствие оппозиционных политиков в новом парламенте дает почву для воспроизводства прежней черно-белой схемы политической жизни Беларуси. Оппозиция и власть опять будут находиться по разные стороны политического процесса (власть в его системной части, оппозиция — в маргинальной). Боюсь, Анатолий Владимирович слишком оптимистичен. Как представляется, высказывания Александра Лукашенко не оставляют нынешней оппозиции места даже в маргинальном секторе. Александр Григорьевич ведь ясно сформулировал: нынешней оппозиции "осталось буквально, может быть, несколько месяцев или лет".

Почему же все-таки власть в последний момент не пошла на то, чтобы пустить демократическую оппозицию в системный сектор политики? Думается, причин несколько. Во-первых, властвующая элита не получила никаких гарантий того, что демократы, придя в парламент, не начнут (при поддержке западных кураторов) наращивать притязания и не взломают политическую систему, не перелицуют ее на свой, так сказать, копыл. Во-вторых, сама оппозиция так и не сумела выработать гибкую линию поведения, понятную и приемлемую для правящего политкласса. Например, тот же А.Лебедько абсолютно недвусмысленно отверг перспективу компромисса: "Даже если в парламент будут "назначены" несколько представителей оппозиции, то эта структура будет признана оппозицией нелегитимной. Мы не будем торговать голосами наших избирателей". В-третьих, объективно электоральный ресурс оппозиции весьма слаб. То, чем она может козырять, есть поддержка Запада. Однако, как показывает ситуация, она (эта поддержка) не безгранична и не безусловна. В-четвертых, Запад, выдвигая официальному Минску демократические требования, вынужден считаться с рядом привходящих факторов. Среди них мировой хозяйственный кризис, который заставляет западные страны более щепетильно относиться к нуждам собственных экономик, в определенной степени завязанным на белорусский транзит. Кроме того, западные дипломаты не хотят делать жестких движений, которые могут толкнуть Минск в объятия Кремля. Запад надеется, что Минск не станет спешить с дипломатическим признанием Южной Осетии и Абхазии. Наконец, в-пятых, не исключено, что Минск получил некие сигналы из Москвы, которая не хотела бы резкого потепления между Беларусью и западным сообществом.

"Красный дом", отлично понимая, что западная дипломатия по-своему заинтересована в налаживании связей и сотрудничества с Минском и не станет резко негативно оценивать итоги парламентских выборов в Беларуси, вполне обдуманно решился поломать логику игры в отношении "ненадежных" демократов, которую несколько месяцев назад выстроил совместно с их западными ходатаями.

***

Значительная часть белорусского общества, правящая белорусская элита по своему духу и привычкам консервативна, с настороженностью относится к демократическим императивам. Такова белорусская реальность. Однако белорусская демоппозиция упорно не хочет с этим считаться (хотя бы из тактических соображений). В результате ее акции постоянно теряют в цене, ее привлекательность в глазах наиболее влиятельных групп населения невелика, с ней не спешит дружить номенклатура. А на выборах о нее вытирают ноги.

Кажется, у белорусских демократов есть один выход, но разговор о нем — отдельная тема.

КРЫМІНАЛ

Ён краў вашы грошы ў «Беларусбанку»

Генеральнай пракуратурай Беларусі накіравана ў суд Ленінскага раёна Мінска крымінальная справа па абвінавачанні жыхара сталіцы ў замаху на крадзеж грашовых сродкаў у буйным памеры з выкарыстаннем камп'ютэрнай тэхнікі. Аб гэтым паведамілі ў Генпракуратуры.

У ходзе папярэдняга расследавання, праведзенага ў Міністэрстве ўнутраных спраў, устаноўлена, што жыхар Мінска (прозвішча да суда не называецца) у верасні 2007 года, выкарыстоўваючы падробленыя банкаўскія пластыкавыя карткі, уводзіў у камп'ютэрныя сістэмы заведама лжывую інфармацыю, атрымліваў несанкцыянаваны доступ да банкаўскіх карт-рахункаў карыстальнікаў і краў грашовыя сродкі. У выніку злачынных дзеянняў ім быў учынены замах на крадзеж грашовых сродкаў на агульную суму 10 млн 550 тыс. рублёў. Пры гэтым абвінавачаны завалодаў грашовымі сродкамі на агульную суму 6 млн 650 тыс. рублёў.

Дзеянні кваліфікаваны па прыкметах замаху на крадзеж маёмасці ў буйным памеры шляхам увядзення ў камп'ютэрную сістэму лжывай інфармацыі, спалучанага з несанкцыянаваным доступам да камп'ютэрнай інфармацыі, кваліфікаваны па арт.14 і ч.3 арт.212 КК (крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютэрнай тэхнікі, учынены ў буйным памеры). У ходзе папярэдняга расследавання накладзены арышт на маёмасць і грашовыя сродкі абвінавачанага на агульную суму каля 330 млн рублёў.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Страшэнная крыўда

У Гомелі апаратыўная група ўпраўлення КДБ затрымала намесніка дырэктара аднаго з таварыстваў з абмежаванай адказнасцю за спробу арганізацыі расправы над сваім кампаньёнам.

Як паведаміла прэс-група УКДБ па Гомельскай вобласці, 47-гадовы намеснік дырэктара быў затрыманы ва ўласным офісе пры перадачы раней судзімаму за рабаўніцтва спартсмену, жыхару Гомеля, пісталета ТТ і патронаў да яго. Балістычная экспертыза засведчыла, што пісталет і боепрыпасы былі ў прыдатным для стральбы стане. Пісталет быў часткай авансу за выкананне "работы" — нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў кампаньёну прадпрымальніка.

Гісторыя канфлікту камерсантаў пачалася восенню 2006 года. Двое гамяльчан стварылі фірму па вытворчасці арміраванага профілю для вокнаў ПВХ. Аднаму з кампаньёнаў належала база прадпрыемства, другому — абсталяванне. Канфлікт узнік пасля таго, як адзін з кіраўнікоў фірмы даведаўся, што яго кампаньён вядзе двайную гульню — рэалізуе няўлічаную па бухгалтэрыі прадукцыю. Вырашыць спрэчку павінен быў Гаспадарчы суд. Кіраўнікі фірмы вырашылі падзяліць маёмасць, але не змаглі дамовіцца. У выніку адзін з іх вырашыў расправіцца з кампаньёнам.

Цяпер заказчык арыштаваны, супраць яго распачата справа па арт.295 КК (незаконныя дзеянні з боепрыпасамі і агнястрэльнай зброяй). Крымінальную справу расследуе ўпраўленне па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю па Гомельскай вобласці.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

Белорусские власти объявляют войну «серым» телефонам

Слух о том, что власти планируют отключить 90% мобильников — так называемых "серых" трубок — не на шутку всколыхнул Беларусь. Произошло это с подачи генерального прокурора Григория Василевича, публично заявившего о том, что Генпрокуратура намерена усилить контроль над рынком незаконно ввезенных в страну телефонов. Дескать, операторам мобильной связи предписали вместе с SIM-картами выдавать новым абонентам некое предупреждение "Об ответственности абонента". В нем должно было быть прямо указано: оператор имеет право отказать в оказании услуг владельцу телефона с "перебитым" номером IMEI.

После выступления Григория Василевича молниеносно разнесся слух: теперь с подачи прокуратуры сотовые операторы отключат все телефоны, ввезенные в страну по "серым" схемам — а это не менее 90% аппаратов. Но вскоре СМИ поспешили успокоить обывателей — нововведения будут касаться только заново подключаемых телефонов. Ситуация постепенно успокаивалась.

Закон о телефонах

И вот новая новость: в Беларуси готовится законопроект, который после вступления в силу запретит сотовым операторам подключать и обслуживать краденые, а также ввезенные в страну нелегально мобильные телефоны. Попросту говоря, если подключаемого телефона не будет в специальной, "легальной" базе IMEI (а ее составляют таможенники и органы внутренних дел), он не сможет работать в сетях белорусских операторов. Законопроект готовит Министерство торговли, активно консультирующееся при этом с МВД и Генпрокуратурой. Известно, что законопроект уже неоднократно отправлялся на доработку; его вступление в силу запланировано на конец 2008-го — начало 2009 года.

Если закон будет принят в нынешнем варианте, в Беларуси будет создана единая общереспубликанская база идентификационных номеров (IMEI) всех телефонов в стране. В нее будут заноситься все телефоны, ввезенные официальными импортерами, а также телефоны, купленные белорусами за рубежом для себя лично. Телефоны, IMEI которых отсутствуют в этой базе на момент, когда вставляется SIM-карта, обслуживаться в сетях белорусских операторов сотовой связи не будут. В Государственном таможенном комитете РБ особо подчеркивают: аппараты, начавшие работать в белорусских сотовых сетях до вступления документа в законную силу, отключаться не будут. Таможенники признали: в таком случае белорусские сотовые операторы были бы вынуждены отключить порядка 90% своих абонентов — именно столько сейчас в пользовании "серых" мобильных телефонов.

Впрочем, в начале лета все начиналось с борьбы с преступностью. Генпрокурор Василевич заявил, что объектом каждой четвертой кражи в стране в 2007 году становился как раз мобильный телефон — всего было зарегистрировано 26 тыс. таких преступлений. Однако наверняка краж было намного больше — известно, как неохотно в милиции принимают заявления о краже мобильников, долго уговаривая потерпевших: "А может, вы его просто потеряли?!" Переломить ситуацию и пообещал Василевич. Впрочем, борьба с карманными воришками быстро перетекла в борьбу с "серым" импортом мобильных телефонов — то есть тем, который идет в обход всяческих пошлин.

Идея нынешней законодательной инициативы в том, чтобы за каждым используемым телефоном закрепить конкретного владельца. Это позволит избежать ситуации, когда на одно имя регистрируются сотни аппаратов, якобы "для личного пользования". Именно так выглядит самая распространенная из "серых" схем ввоза мобильников в Беларусь. В результате на "сером" рынке телефоны стоят как минимум на 30% дешевле, чем у "белых" продавцов, ввозящих их с соблюдением всех таможенных процедур. По прогнозам специалистов Генпрокуратуры, белорусскому рынку потребуется для "обеления" до трех лет — именно за это время большинство владельцев сменят свои аппараты на новые.

Слово прокуратуры

Для белорусских журналистов "телефонный вопрос" активно комментировал начальник отдела Генпрокуратуры по надзору за дознанием Салауди Магамадов. Вот несколько его цитат:

"Генпрокуратура не имеет прямого отношения [к законопроекту]. Мы лишь будем надзирать, чтобы после вступления этого закона в силу он соблюдался всеми гражданами нашей страны без исключения. [...] IMEI всех телефонов, которые будут ввозиться на территорию республики, будут заноситься в специальную, единую республиканскую базу. Эти базы будут находиться в распоряжении также и сотовых операторов. И они будут обязаны предоставлять услуги связи только для тех аппаратов, IMEI которых в этой базе будет. Всем остальным в услугах связи будет отказано. [...] Таким образом, этот закон позволит постепенно избавиться и от рынка "серых" телефонов, и от их воровства. [...] Времени на создание самой единой базы по учету IMEI-номеров понадобится очень немного. Она же будет электронной, а не бумажной".

Отдельный вопрос, который задают практически все: как быть человеку, который самостоятельно купил телефон за рубежом, привез в Беларусь и хочет им пользоваться в личных целях? Салауди Магамадов отвечает так: *"В этом случае гражданин должен пройти в установленном порядке процедуру занесения этого телефона в базу. При этом он должен будет взять с собой паспорт. В итоге в базе будет IMEI телефона и личные данные владельца. Сами понимаете, что если вдруг окажется, что IMEI аппарата, который принесли для регистрации, окажется в списке краденых телефонов, у правоохранительных органов возникнут вопросы".*

Эта процедура будет не бесплатной. Торговцы мобильниками утверждают, что стоимость регистрации составит 50—100 евро. Магамадов отказывается предсказывать стоимость процедуры, говоря одно: *"Это будет гораздо дешевле 100 евро, и вряд ли сумма будет слишком обременительной для абонента".*

И в заключение весьма показательная цитата: *"В масштабах государства деньги, недополучаемые в бюджет от уплаты таможенных пошлин на мобильные телефоны, просто мизерные. У государства масса других, куда более существенных источников пополнения бюджета. Так что данный законопроект создается исключительно во благо потребителей и бизнеса, а не для пополнения бюджетных средств".*

Странная статистика

Кстати, пресс-служба ГУВД Мингорисполкома недавно опубликовала довольно странную статистику. Оказывается, раскрываемость краж мобильников составляет всего 14,3%. Милиционеры связывают это с тем, что злоумышленники после кражи оперативно перепрошивают телефон — обновляют его программное обеспечение, меняя при этом идентификационный номер телефонной трубки (IMEI). После этого установить, кем используется похищенный телефон, становится невозможно.

Однако при этом за восемь месяцев нынешнего года количество краж мобильных телефонов в Минске снизилось на 40% по сравнению с аналогичным периодом прошлого года. Почему — сказать сложно, ведь закон о блокировке краденых и "серых" телефонов еще только готовится. Так или иначе, больше всего краж сотовых в Минске происходит во Фрунзенском и Московском районах — в них регистрируется каждая пятая кража мобильного телефона.

НАША СПРАВКА

IMEI (International Mobile Equipment Identity) — международный идентификатор мобильного оборудования, число (обычно 15-разрядное в десятичном представлении), уникальное для каждого мобильного телефона. Узнать IMEI телефона можно, набрав на клавиатуре последовательность символов *#06#.

IMEI устанавливается на заводе при изготовлении, служит для идентификации устройства в сети. Хранится в прошивке аппарата, как правило, написано на упаковке, в гарантийном талоне, а также под батареей мобильного телефона.

IMEI выполняет роль серийного номера аппарата. Передается в эфир при авторизации в сети. IMEI используется для отслеживания аппаратов и для блокирования краденых телефонов на уровне оператора сотовой связи.

СІТУАЦЫЯ

Гродзенскі камбінат будаўнічых матэрыялаў знаходзіцца на мяжы спынення вытворчасці

У выніку цяжкасцяў, якія ўзніклі з продажам прадукцыі, гродзенскі камбінат будаўнічых матэрыялаў знаходзіцца на мяжы спынення вытворчасці. Адсутнасць попыту вымушае працаваць на склад, а адміністрацыя прадпрыемства характарызуе сітуацыю як адмоўную.

Прычын незапатрабаванасці цэглы і блокаў гродзенскай вытворчасці некалькі: перш за ўсё - - высокія кошты і істотнае змяншэнне экспарту ў Расію і краіны Балтыі. З увядзеннем абавязковых аўкцыёнаў на продаж зямельных участкаў колькасць жадаючых пабудаваць уласны дом зменшылася да крытычнай адзнакі, што непасрэдна адбілася і на працы прадпрыемства: калі на пачатку года чэргі жадаючых набыць прадукцыю камбіната будаўнічых матэрыялаў складалі некалькі тысяч чалавек, то цяпер яны адсутнічаюць увогуле.

Сітуацыяй занепакоены не толькі на прадпрыемстве, але і ў Гродзенскім аблвыканкаме, кіраўніцтва якога патрабуе ад будаўнічых прадпрыемстваў вобласці нарошчваць магутнасці і набываць гродзенскую цэглу. Аднак айчынная будаўнічая галіна базіруецца пераважна на выкарыстанні панельных тэхналогій, таму купляць незапатрабаваныя будаўнічыя матэрыялы ў непатрэбных колькасцях ніхто не збіраецца.

Па падліках адміністрацыі гродзенскага камбіната будаўнічых матэрыялаў, экспарт прадукцыі праз некалькі гадоў увогуле сыдзе на нуль, у сувязі з чым ужо сёння неабходна мяняць далейшую стратэгію і ажыццяўляць паступовае скарачэнне працоўных месцаў.

КОММЕНТАРИЙ

Голос «Ждановичей»

За комментариями автор этой статьи отправился в место, которое можно назвать своего рода "логовом" тех, кто перепрошивает украденные или потерянные сотовые телефоны, а также активно торгует контрафактными трубками, — в специализированные "телефонные" ряды рынка "Ждановичи". Там, как выяснилось, нет единодушия. Но сворачивать полукриминальный бизнес не собирается никто.

Неизвестный покупатель:

— А как быть туристам и командировочным, приехавшим в Беларусь со своим телефоном?

Сергей, продавец:

— Я, "серый" продавец, буду торговать, как и торговал. А вот уже мои покупатели будут идти регистрировать телефон, говоря, что, мол, сам съездил в Москву или Киев и купил там. Хотя, конечно, это выход только для продажи телефонов без проверки их работоспособности. Ведь в незарегистрированный аппарат, получается, SIM-карту не вставишь...

Максим, продавец:

— Думаю, очень быстро появятся предложения о внесении трубки в базу за определенную плату. Доллары решат все проблемы!

Татьяна, покупатель:

— Да просто власти хотят легализовать механизм, по которому можно будет однозначно определить соответствие IMEI-номер — человек. Хотят подвести нормативную базу под "прослушку", чтобы облегчить следователям жизнь.

Андрей, оптовый поставщик:

— Полностью "серые" телефоны с рынка не уйдут. Всегда будет спрос на модные новинки типа iPhone. Просто покупатель будет брать у меня телефон и идти регистрировать его самостоятельно, говоря, что купил аппарат за рубежом. Да, торговцы пострадают, особенно те, кто торгует дешевыми трубками. Но полностью избавиться от нелегального ввоза не удастся. Причина в том, что у нас идиотская система прохождения процедуры сертификации. "Специалисты" в госструктурах проверяют телефоны на пригодность для работы в наших сетях по полгода и более. За это время все, кто хотел купить новинку, покупают ее у нелегальных продавцов. А потом она выходит из моды, спрос и цена на нее падают. Зато появляется что-то новое, что опять будут сертифицировать полгода.

Виктор ДЕМИДОВ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

РЭПЛІКА

Калі вы, спадарыня Бушная, дырэктар беларускамоўнай гімназіі...

Не магу зразумець кадравую палітыку Мінскага гарадскога камітэта адукацыі. Цікава, якія якасці чалавека ўлічваюцца пры падборы на пасаду, напрыклад, дырэктара беларускамоўнай гімназіі? Неяк па БТ паказвалі інтэрв'ю з кіраўніком сталічнай гімназіі №1 імя Францішка Скарыны. Узначальвае гэту нацыянальную ўстанову спадарыня Бушная. Здавалася б, каму, як не ёй, уласным прыкладам прапагандаваць беларускую мову. А яна на ўсе пытанні адказвала толькі па-руску.

Скажыце, спадарыня Бушная, якое маральнае права вы маеце займаць пасаду дырэктара гімназіі №1 імя Францішка Скарыны пры такім непаважлівым стаўленні да беларускай мовы?

Мацвей КУНЦЭВІЧ,
сябра ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны".

ГОЛАС НАРОДА

«А чым яны займаюцца?»

Увесь час перад выбарамі дэмакраты спрачаліся, якую ж пазіцыю заняць — ці ўдзельнічаць у кампаніі, ці байкатаваць яе, крытыкавалі адзін аднаго, аспрэчвалі... Можа, і не вельмі хораша гэта было, але па-чалавечы зразумела. Але я не магу зразумець, а чым жа ўвесь гэты час займалася партыя КХП-БНФ? Яны і ў выбарах не ўдзельнічалі, і на акцыях пратэсту не прысутнічалі, ні ўлётак не раздавалі, ні ў пікетах не стаялі.

Як я разумею, палітычная дзейнасць — гэта ўсё-такі дзейнасць. А чым займаецца партыя, якой з эміграцыі кіруе Зянон Пазьняк, ведаюць толькі яны самі.

Навум ПРЫШЧЭПА,
Мінскі раён.

"Трапеча ён, нібы жывы агеньчык..."

Хацела б падзякаваць Партыі БНФ! Як ні праходжу па былой вуліцы Варвашэні, так сэрца і трапеча: вельмі прыемна бачыць, як на будынку, дзе месціцца офіс партыі, лунае бел-чырвона-белы сцяг. У родным горадзе родны сцяг! Ці не цудоўна гэта?!

Трапеча ён на ветры, нібы жывы агеньчык, і так прыгожа і хораша на душы робіцца, што перадаць вам не магу.

Шчыра скажу, часам прыязджаю ў гэты куток Мінска нават не па справах, а так проста, для душы — на сцяг паглядзець.

І.В.ВАРАНОЎСКАЯ,
г.Мінск.

«Вось і мерзнем мы ад таго, што ўлада наша такая моцная»

Ну, ці ёсць так у якой яшчэ краіне, каб ключэнне ацяплення ў кватэрах і дамах ператваралася ў сапраўдную ваенную аперацыю, на пачатак якой загад павінен аддаць асабіста генералісімус?! Ні ў адным горадзе, ні ў адным мястэчку без загаду "зверху" ўлады не здольныя прыняць рашэнне аб уключэнні ацяплення. Ці не бязглуздзіца? Ці не сведчанне гэта, што ў краіне адбываецца нешта не тое?..

Як вынік — мерзнем мы ў XXI стагоддзі па сваіх кватэрах ад таго, што ўлада наша такая моцная, такая цэнтралізаваная, што без яе ні адзін сантэхнік кранік не адкруціць.

Валянціна ІСАЕНКАВА,
г.Віцебск.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

Не часта "Народная воля" вяртаецца да надрукаванага, скажам, праз шэсць—восем месяцаў. Але калі ёсць у гэтым неабходнасць, то ідзём на такі крок.

На гэты раз у нас няма маральнага права адмовіць у прадастаўленні старонак газеты пісьменніку Васілю Якавенку, пастаяннай чытачцы з Шаркоўшчыны Наталлі Асіпенка, вядомай актывістцы Ірыне Кісялёвай. Іх нататкі — гэта водгук на ўспаміны Галіны Пазьняк пад назвай "Беларусь у сэрцы", якія "Народная воля" друкавала на працягу доўгага часу і якія, спадзяёмся, добра памятаюць нашы чытачы.

Рэдакцыя не каменціравала мемуары Г.Пазьняк, пакідае яна без каментарыяў і лісты сённяшніх аўтараў. Усё — на роздум чытачоў.

Ці не зашмат чорнай фарбы?

Адкрыты ліст Зянону Пазьняку

Вас, Зянон Станіслававіч, мабыць здзіўляе, што наш ліст адрасуем не Галіне, а Вам. О, гэта вельмі лагічна. Ваша прадмова да кнігі Галіны Вашчанкі-Пазьняк і ацэнка яе дзейнасці ў Фронце вельмі многа азначаюць! Прачытайце ўспаміны ўважліва і з алоўкам у руцэ: у нашым вялікім адраджэнскім Руху, што называўся Народным Фронтам, няма ні В.Вячоркі, ні Ю.Беленькага (а Рух, можна сказаць, пачынаўся з іхняй "Талакі"!), ні В.Голубева, ні У.Заблоцкага, ні Л.Баршчэўскага, ні многіх іншых славутых асоб!

А дзе ж нашы знаўцы гісторыі Беларусі і адданыя ёй славутыя мастакі, якія, можна сказаць, былі яркім ядром Руху — А.Марачкін, Я.Кулік, М.Купава і многія іншыя, якія па начах працавалі над плакатамі і транспарантамі, што рабілі фронтаўскія мерапрыемствы насычанымі сэнсам! Усе мастакі і сёння працуюць на нашу краіну, не баючыся таго рэжыму, у які Вы з Галінай баіцеся вярнуцца!

Галіну можна прабачыць: яе дзейнасць (гэта бачна і па яе "Успамінах") абмяжоўвалася колам гарсавета і Койданаўскай Радай. Яна, як мы разумеем, знаходзілася збоку нашага Вялікага Руху і не ведала, не бачыла, не разумела маральна-ўзвышанага подзвігу гэтых людзей. Але ж Вы, Зянон Станіслававіч, чаму не спынілі непрыстойныя выказванні Галіны ў адрас Вашых паплечнікаў, аднадумцаў, сяброў? Мы не будзем паўтараць радкоў Галіны, каб не радаваць лішні раз ворагаў Адраджэння. Адзначым толькі тое, што Галіна валодае зайздросным майстэрствам мімаходам мазануць чалавека чорнай фарбай... Божа літасцівы! На сваіх аднадумцаў з такой лёгкасцю кідаць бруд!

Любы, самы цёмны чалавек, ведае, што пра памерлых гавораць толькі добрае ці нічога. Пра В.Ганчара, які ў свой час ініцыяваў імпічмент і за тое паплаціўся жыццём, так сказаць! Як такое чытаць маці Віктара, яго жонцы, сыну?!

А чаго варта меркаванне Галіны пра раскол Фронту? Уяўляем, якую радасць даставіла аўтарка "Успамінаў" ворагам нашага Адраджэнскага Руху!

Лічу неабходным спыніць сваю ўвагу і яшчэ на адным моманце. Калі апазіцыйная група парламента аб'явіла галадоўку, мы ўвесь дзень і да паловы першай гадзіны ночы былі на плошчы Незалежнасці. Месціліся каля мікрафона, які быў спачатку ў руках В.Вячоркі, потым — В.Сіўчыка. Але не бачылі, каб па плошчы хадзіў Ю.Хадыка і адпраўляў усіх "дадому", як пра тое напісала Галіна ў кнізе. Не было такога! Мы падтрымлівалі сувязь з галадоўшчыкамі праз Галіну Сямдзянаву. Яна час ад часу выходзіла на плошчу і інфармавала нас пра справы ў Авальнай зале. Разышліся мы толькі пасля таго, як Сямдзянава вынесла нам і дала прачытаць Ваш ліст, Зянон Станіслававіч, да М.Грыба і абвясціла, што ўсё ў парадку і мы можам пакуль ісці дамоў.

Нельга не абысці ўвагай і цікавы расказ Галіны пра яе камітэт "Дзеці Чарнобыля", уся праца якога (па "Успамінах"!) заключалася ў выездзе дзяцей на месяц у Плешчаніцы і наведванне інтэрната з хворымі дзеткамі ў Мінску. Колькі ж такіх камітэтаў пры Фронце было, Зянон Станіслававіч? І чаму не сказана, што гэта быў ужо трэці? Мы, праўда, пра яго не ведалі.

Памятаем, як усіх, хто хварэў душой за пакінутых у зоне дзетак, збіраў мастак М.Купава. Ён быў нашым першым камандзірам. Потым Купава прапанаваў нам абраць старшыню. Аднагалосна мы абралі Тамару Белавокую — яна мела медыцынскую адукацыю і працавала ў Навукова-даследчым інстытуце радыяцыйнай медыцыны. Галіны Вашчанкі ў нашым камітэце "Дзеці Чарнобыля" не было! Праз некаторы час нас сабраў Г.Грушавы і аб'явіў, што на сойме БНФ яго прызначылі старшынёй камітэта. Мы працягвалі працаваць з імі. Грушавы з Белавокай мелі свае накірункі. Па лініі Белавокай мы часта выступалі перад бацькамі з парадамі, як у небяспечных умовах зберагчы дзяцей, як і чым іх карміць. Белавокая, працуючы ў Інстытуце радыяцыйнай медыцыны, надавала вялікую ўвагу праблеме пастаяннага ўнутранага забруджвання арганізма малымі дозамі радыяцыі, якія атрымлівалі дзеці, ужываючы забруджаныя радыенуклідамі прадукты харчавання. Пад рэдакцыяй Т.Белавокай сумесна з іншымі супрацоўнікамі інстытута выходзіў зборнік артыкулаў на гэту тэму, выпускаўся інфармацыйны бюлетэнь пастаянна дзеючага семінара.

У першай палове 1991 года нашым камітэтам была створана вялікая мастацка-публіцыстычная выстава "След Чарнобыля", якая была размешчана ў выставачным памяшканні Інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі (пр.Машэрава). У чэрвені 1991 года мы вывозілі гэтую выставу ў Польшчу (Гайнаўка, Музей беларускай нацыянальнай культуры).

Што тычыцца камітэта, які ўзначаліў Грушавы, то ён стаў у свой час "косткай у горле" беларускаму ўраду. Грашавы з жонкай Ірынай арганізаваў і вывозіў за мяжу дзесяткі тысяч дзяцей, якія аздараўляліся і лячыліся не ў Плешчаніцах, а ў Германіі, Бельгіі, Польшчы і іншых краінах. Па ініцыятыве камітэта дзесяткі беларускіх медсясцёр без усялякай аплаты вучыліся ў замежных калег па абслугоўванні анкалагічна хворых дзяцей, якіх станавілася ўсё больш і больш...

Пазней Грушавы здолеў арганізаваць "След Чарнобыля" (Гомель) і "Арганізацыю гуманітарнага супрацоўніцтва" (Мінск). Наладжвалася напрамую сувязь найбольш забруджаных гарадоў, вёсак з замежнымі базамі адпачынку і лячэння для вырашэння канкрэтных паслячарнобыльскіх праблем.

У 1991 годзе Грушавы правёў міжнародную канферэнцыю па паталогіі шчытападобнай залозы ў дзяцей і дарослых Беларусі.

Камітэтам "Дзеці Чарнобыля" мы ездзілі ў зону — Магілёўскую вобласць (Чэрыкаўскі, Краснапольскі, Слаўгарадскі раёны), удзельнічалі ў стварэнні Фронтам "Трыбуналу" (кастрычнік 1991 г.) па чарнобыльскіх праблемах. Сведкамі на гэтым "Трыбунале" былі жыхары вёсак, дзе мы пабывалі. Дарэчы, пракурорамі на "Трыбунале" былі В.Быкаў і А.Адамовіч, навуковыя супрацоўнікі. Рыхтаваў і праводзіў "Трыбунал" прафесар Ю.Хадыка. Галіна Вашчанка, прэтэндуючы на летапіс усяго фронтаўскага Руху, спынілася чамусьці толькі на сваім камітэце.

Зянон Станіслававіч! Вы ў свой час так многа зрабілі для Беларусі: абудзілі беларусаў ад сну, прымусілі сотні тысяч "тутэйшых" узгадаць, што ў іх ёсць нацыянальнасць, што беларусы вартыя мець сваю незалежную свабодную краіну. І раптам... ухваленне "Успамінаў", якія асабіста ў мяне нараджаюць шмат пытанняў.

Ірына Васільеўна КІСЯЛЁВА,
былы сябра камітэта "Дзеці Чарнобыля".

Кожную публікацыю я чакала з нецярпеннем

Добры дзень, паважаная рэдакцыя газеты "Народная воля"!

Газету вашу выпісваю з першага года яе заснавання і чытаю з задавальненнем. Асабліва цікавай яна стала ў апошнія дватры гады.

Мне вельмі падабаюцца артыкулы Сямёна Букчына, Сяргея Буткевіча, Міколы Канаховіча, Алега Волчака, Аляксандра Ярашука. Але самае вялікае ўражанне на мяне аказалі публікацыі Галіны Пазьняк "Беларусь у сэрцы". Яны проста перавярнулі ўсё ў маёй душы. Кожную новую публікацыю я чакала з вялікім нецярпеннем. Тым больш здзіўлена, што ў другіх чытачоў гэта не выклікала асаблівага рэзанансу. Можа, я такая наіўная, але ўсё роўна веру кожнаму Вашаму слову, паважаная Галіна Фёдараўна.

Чытаючы Вашы ўспаміны, я перажывала разам з Вамі, а таму проста не магла не напісаць у газету. Нізкі Вам паклон за мужнасць, самаадданасць справе, за любоў да нашай шматпакутнай Радзімы, а мужа Вашага, Зянона Станіслававіча, гісторыя яшчэ ацэніць, я ў гэтым упэўнена. Людзі, якім неабыякавы лёс краіны, ужо зразумелі, кім быў у той час Зянон Пазьняк і колькі зрабіў ён для Беларусі. Такую яркую асобу нават параўноўваць ні з кім не хочацца.

Жадаю Вашай сям'і моцнага здароўя і сіл перажыць усе выпрабаванні, а больш за ўсё хачу, каб хутчэй настаў той час, калі Вы зможаце вярнуцца на Радзіму без пагрозы жыццю. Вы тут вельмі патрэбны, можаце не сумнявацца. Людзей, якія Вас любяць і падтрымліваюць, многа.

З павагай —

Наталля АСІПЕНКА.

г.п.Шаркоўшчына Віцебскай вобласці.

АЛЬТЭРНАТЫЎНЫ ЛІСТ

Дазвольце не пагадзіцца...

Ліст пісьменніка Васіля Якавенкі Галіне Пазьняк пасля прачытання яе кнігі "Беларусь у сэрцы"

Цудоўная рэч — успаміны сведак велічных і драматычных падзей, а тым больш калі аўтар яшчэ і саўдзельнік і блізкі чалавек дзеячу, такому, напрыклад, як З.Пазьняк.

Мне прыкра, аднак, спадарыня Галіна, былая Вашчанка, бо сколькі б ні было той Беларусі ў вашым сэрцы, а шчырасці ў кнізе, лічу, бракуе, адчуваецца зададзенасць, і, раз-пораз узводзячы на людзей ману, вы ганьбіце ў самой сабе годную, гожую і патрыятычна дзейсную беларуску. Не буду гаварыць далей пра ўсю кнігу **"Беларусь у сэрцы"**, а толькі пра тое, што тычыцца мяне. Возьмем падзагаловак "Прапанова В.Якавенкі і С.Міхнова". Цытую: *"Аднаго разу вясной С.Міхноў прывёў на пасяджэнне Рады Васіля Якавенку. Ён жыў ня ў нашым раёне і тады ўжо ня быў сябрам Фронту (у 1989 годзе ён выступіў, здаецца, у "Советской Белоруссии" супраць дзеянняў фронту і яго выдалілі з БНФ па ідэйных меркаваннях). Тым ня менш ён прыйшоў да нас з прапановай, каб мы ўсёй Радай узяліся за добраўпарадкаванне Паўднёвага Захаду".*

Далей вы прыводзіце нейкія спрэчкі паміж намі наконт таго, ці выходзіць на суботнік са сцягамі ці без іх. Маўляў, я не пагадзіўся на сцягі БНФ і, вядома ж, абраны, сказаў, што ў такім разе "не збіраюся прадстаўляць вам інструменты і саджанцы" ды лясНуў дзвярыма", і кропка. Пардон. У агародзе бузіна, а ў Кіеве — дзядзька.

Ніякімі інструментамі і саджанцамі я не загадваў, не помню спрэчак пра сцягі, не ляскаў дзвярыма. Мы ж па-добраму дамовіліся, і суботнік адбыўся, адно я не помню вашай асобы на ім. Вы абражаеце мяне, пішучы, што тут мела месца правакацыя. Усё неабходнае для працы, тэхніку і трактар для звозу лому і смецця тады выдзеліў нам райвыканкам. Энтузіязм, пра які ўвогуле вы згадваеце, быў, і я, жыхар гэтага ж раёна, працаваў разам з усімі насуперак вашым, спадарыня, заўвагам і ламентацыям. Вашу заўзятасць і ману ў кнізе, дарэчы, пацвярджае публікацыя "Поработаем в саду" у газеце "Вечерний Минск" за 13.06.1989 года. Цытую: *"Житель Юго-Запада председатель Координационного совета "Беларускага экалагічнага саюза (БЭС)" писатель Василь Яковенко высказал предложение создать в микрорайоне орган экологического самоуправления. Участники заседания одобрили его предложение".*



Суботнік, паўтараю, адбыўся.

Далей наконт "выдалення" мяне з Народнага фронту... Выдаліць мяне было чыста Зянонавым жаданнем і стала ягонай выдумкай, у якой ён, напэўна, і Вам, цяперашняй любай жонцы сваёй, не прызнаўся. Калі ж вы ўсё-такі ведаеце, як насамрэч было, і сцвярджаеце так, як напісана, то гэта зноў жа выглядае чыстым паклёпам. У сваёй публікацыі ў "Советской Белоруссии" за 18 лютага 1999 года "Перестройка — наша судьба", якая была прысвечана ў цэлым перабудове, я, зразумела, не абышоў і Народны фронт. Адно, гаворачы пра засілле ў грамадскай сферы сытых чыноўнікаў, саму перабудову я звязваў толькі і толькі з народным рухам за адраджэнне. Цяпер, вярнуўшыся да той гутаркі журналісткі І.Гурыновіч са мной і самой публікацыі, я скажу вам: артыкул вытрыманы ў пазітыўным духу. І гэта, нягледзячы на тое, што С.Паўлаў, загадчык аддзела ЦК КПБ, дыхаючы рэдактару газеты ў патыліцу, прымусіў яго вымараць, выдаліць з тэксту мясціны, дзе наўпрост гаварылася пра азаніруючую грамадства ролю Народнага фронту, пра яго набытую за кароткі тэрмін станоўчую дзейнасць. Засталіся меркаванні, выказаныя як перасцярога ад залішне адыёзных і экстрэмісцкіх учынкаў. Я ніяк не збіраўся выступаць супраць Народнага фронту, да разгортвання працы якога і сам прыклаў шмат намаганняў. Але ж увесь час я адчуваў: бракуе інфармацыі пра дзейнасць, пра чыннасць, пра намеры БНФ. Я шукаў трыбуны для выступу.

У Аргкамітэце перш былі спадзяванні на тэлебачанне, і недзе ў лістападзе—снежні 1988 года творчая група ТВ падрыхтавала, як цяпер кажуць, відэаролік пра беларускі рух за адраджэнне. Шкада, але на тым інфарматыўным і яскравым відэароліку паставіў крыж старшыня тэлерадыёкамітэта Г.Бураўкін, — пэўна, на той час Генадзь Мікалаевіч яшчэ не выспеў для ўспрыняцця і падтрымкі ідэй БНФ. Публікацыя ў "Советской Белоруссии" была другой спробай адкрыта і шчыра расказаць людзям пра тое, чаму належала стаць масавым і сапраўдным народным рухам. Атрымалася, праўда, не так, як хацелася б, але і не так, як вы, спадарыня Галіна, паказваеце. Тым больш, што акурат гэтая публікацыя паспрыяла таму, што на мітынг БНФ, які ладзіўся на наступны дзень на стадыёне "Дынама", сабралася багата людзей. Я ж выступіў на тым мітынгу з заклікам ставіцца да Народнага фронту з даверам, шырыць і мацаваць рух , бо гэта адзіны гарант перабудовы, якая была ўжо амаль патопленая ў словаблудстве чыноўнікаў і самога Гарбачова. Ці чулі вашы ласкавыя вушы тое, пра што я казаў? Забылі, шаноўная.

Тады давайце вернемся да "выдалення"... Вы ж звязваеце яго з маёй публікацыяй у газеце "Советская Белоруссия". Лухта непрасеяная! Прачытайце, што там напісана. Журналістка І.Гурыновіч пытаецца ў мяне, чаму я выйшаў з Аргкамітэта БНФ. Адказ: *"Здесь требуется одно уточнение: вышел я из Мартиролога, в котором и не был... Вы удивлены? Попытаюсь объяснить..."*

Цяпер, Галіна, калі ваш муж не прызнаўся вам у тым, што было ў тыя ўжо гістарычныя дні, раскрыю "тайну".

Рух дзейнічаў не ў прававым (фармальна) полі, а напаўлегальна. І, каб яму стаць юрыдычна прызнаным, зарэгістраваным Мінюстам, неставала ўстаноўчай канферэнцыі, статута, праграмы.

Пасля таго як паралельна з Мартыралогам быў абраны Аргкамітэт БНФ, у яго працы не было ні ладу, ні складу. Незваротна мінулі дні, тыдні — апроч дробных дваровых улётак, нічога не рабілася, і мяне гэта трывожыла. Я падзяліўся сваёй трывогай з З.Пазьняком і прапанаваў яму ўзначаліць Аргкамітэт. Пазьняк адмовіўся, ён патлумачыў, што ўзначальвае Мартыралог і з яго, маўляў, гэтага дастаткова. Тады (калі не памыляюся), на першым жа прадстаўнічым зборы, па рэкамендацыі В.Быкава, старшынёй Аргкамітэта БНФ абралі мяне. Я быў на той час ужо спрактыкаваным публіцыстам і меў поспех у арганізацыі міжрэспубліканскіх культурна-экалагічных экспедыцый па Заходняй Дзвіне, Дняпры, Прыпяці, у барацьбе з чыноўнікамі мы выйгралі справу і паставілі крыж на бязглуздым асушэнні шырокай прыпяцкай поймы. К таму часу, дарэчы, я паспеў спазнацца і з народным рухам за нацыянальнае адраджэнне ў Нагорным Карабаху.

Разам з сябрамі па аргкамітэце БНФ мы наладзілі працу. Актыўнасць дружыны была найвышэйшая — справы пайшлі. З.Пазьняк выяўляў свой розум і досвед у калектыўнай распрацоўцы праграмных палажэнняў БНФ.

Але ж маё лідэрства ў Аргкамітэце Зянон успрымаў вельмі хваравіта і пачаў усяляк тарпедаваць на пасяджэннях мае прапановы. Ён нярэдка адсутнічаў на нашых зборках. Ён адсутнічаў і тады, калі мы пры падтрымцы В.Быкава, Р.Барадуліна, А.Марачкіна, А.Емельянава і іншых сяброў аргкамітэта прынялі рашэнне аб падрыхтоўцы і правядзенні ўстаноўчай канферэнцыі ў Мінску. Статут і Праграма для рэгістрацыі БНФ на той час былі ўжо падрыхтаваныя. Таму без адтэрміноўкі ўзяліся за правядзенне сходаў заснавальнікаў БНФ у розных калектывах, выбіраць дэлегатаў. У напружаных спрэчках, але даволі паспяхова, напрыклад, выбралі 30 дэлегатаў на агульным сходзе ў Саюзе пісьменнікаў.

І вось чарговае пасяджэнне, на якое прыйшлі пераважна маладыя сябры Аргкамітэта, з'явіўся і З.Пазьняк. Ён быў суровы, надзьмуты. Аргсакратар паэт А.Емельянаў зрабіў традыцыйнае паведамленне пра тое, што зроблена за час між пасяджэннямі, расказаў пра сход пісьменнікаў і ўвогуле пра падрыхтоўку ўстаноўчай канферэнцыі. "А якая гэта яшчэ канферэнцыя?" — грозна спытаўся Пазьняк. Емельянаў патлумачыў, але ж яго тлумачэння яму паказалася мала. Тады ўзняўся з месца я. Мая перакананасць у неабходнасці ўстаноўчай канферэнцыі разглавала яго наогул: "Канферэнцыя будзе біць па Мартыралогу! Яе правядзення нельга дапускаць!" — заявіў ён. "Чаму, спадар Пазьняк? — здзіўлена ўсклікнуў я. — Пры чым жа тут Мартыралог, калі мы на пасяджэнні Народнага фронту? — "Вон з Мартыралога!!!" — выгукнуў што было моцы Зянон.

Я анямеў, у мяне ад абразы і моцнага хвалявання перасохла ў роце. Я тут жа зразумеў падступны намер Пазьняка: прадставіць справу так, быццам Аргкамітэт Народнага фронту — гэта ўсё той жа Мартыралог, які ён узначальвае. І яшчэ: канферэнцыя, калі справа выйдзе з-пад яго кантролю, можа абнавіць Аргкамітэт, а старшынёй БНФ, чаго добрага, пакінуць В.Якавенку, што тады моцна ўдарыла б па амбіцыйных намерах З.Пазьняка перахапіць у Аргкамітэце ініцыятыву, уладу, з дазволу сказаць... Мартыралог тут быў ні пры чым. Усе, хто прысутнічаў на тым пасяджэнні, маўчалі, мусіць, таксама анямелыя ад грубасці і хамства Зянона. Але ж, мяркую цяпер, мала хто мог здагадвацца, у чым насамрэч справа. Тады я сабраў свае паперы ў папку і сказаў: "Прабачце, я не ведаў, што тут праходзіць пасяджэнне Мартыралога. Я не ўступаў у Мартыралог і, калі так, то пакідаю вас. Бывайце здаровы!" Усе маўчалі.

Алесь Марачкін, сведка і ўдзельнік таго, што адбылося ў той вечар, потым паведаміў мне: на чарговым пасяджэнні Пазьняк, фабрыкуючы "справу", паставіў пытанне аб выключэнні мяне з Аргкамітэта. Прагаласавалі, але большасці галасоў прысутных сяброў Аргкамітэта прапанова не набрала, рашэння не было, і Якавенка заставаўся надалей старшынёй Аргкамітэта. Цяпер, даруйце, спадарыня Галіна: пасля той дзікай выхадкі я ўжо не мог бачыць на ўласныя вочы вашага куміра Зянона Пазьняка. Рабіў далей, што рупіла, і з чыстым сумленнем заставаўся ў Народным фронце. А вы ўводзіце ў зман чытачоў, сцвярджаючы, што мяне "выдалілі" з Народнага фронту. Адно, я спадзяюся, рабіў і зараз раблю па абвешчанай некалі нацыянальнай праграме Народнага фронту, па адстойванні ягоных пазіцый зусім не меней за вас.

Абразілі вы ў сваёй кнізе і С.Міхнова. Ні за што. Бо калі ён вам у давяральнай размове распавёў пра сваё бачанне З.Пазьняка і яго недахопы, то навошта зараз вываротваць і ставіць гэта за віну і грэх Міхнову? Балазе ён не без падстаў даводзіў вам свае думкі, і я ведаю дзесяткі людзей, у тым ліку і былых паплечнікаў Зянона, якія даводзяць тое ж. Але ж патрабаваць аднолькавага мыслення ў галовах свайго атачэння могуць толькі агаломшаныя дыктатары.

Скажу вам шчыра, у чым было галоўнае адрозненне між мною і Пазьняком у Народным фронце. Пазьняк праг улады. А мэтай сяброў Аргкамітэта, прынамсі, такіх як Быкаў, Барадулін, Мальдзіс, Купава, Марачкін, я ды, напэўна ж, і малодшых сяброў, былых талакоўцаў, была зусім не ўлада, а краіна без дурняў і дэспатаў ва ўладзе, - краіна, якая б належала нам і ў якой бы мы, як і ўсе грамадзяне, пачувалі б сябе гаспадарамі. Разыходжанні ў нас былі па тактычных пытаннях, і тое, чаго я баяўся, здарылася.

Васіль ЯКАВЕНКА,
пісьменнік.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Европа отметила День иностранных языков

Он родился в 2001 году, когда ЮНЕСКО провозгласило XXI век веком полиглотов. На весь мир прозвучал девиз "Изучаем иностранные языки на протяжении всей жизни!".

В этом году празднование прошло в Париже, в одном из старейших европейских университетов — Сорбонне. В амфитеатре собралось руководство Евросоюза, переводчики, журналисты и преподаватели иностранных языков.

Среди основных направлений языковой политики Евросоюза — поддержка переводческой деятельности. В ЕС 23 официальных языка; а некоторые национальные литературы не известны широкому читателю из-за отсутствия перевода. Знать иностранные языки необходимо и по политическим соображениям.

Австрия: сдвиг вправо

Две австрийские ультраправые партии — Партия свободы и Альянс за будущее Австрии — по результатам состоявшегося в воскресенье всеобщего голосования получили 35-е и 21-е место в парламенте соответственно, набрав в общей сложности 29 процентов голосов, передает агентство AP.

Таким образом, по сравнению с итогами выборов 2006 года Партия свободы увеличила свое представительство в парламенте более чем в полтора раза, а Альянс за будущее Австрии — в три раза. Всего в австрийском парламенте 183 места, то есть представители обеих партий составят почти треть парламента.

Победитель выборов — Социал-Демократическая партия — набрала лишь на 0,7 процента голосов больше, чем ультраправые. Ее представительство снизится с 68 до 58 мест. Народная партия, набравшая 25,6 процента голосов, потеряет 16 мест и будет иметь в новом парламенте лишь 50 мандатов.

Таро Асо сорвал аплодисменты на Генассамблее ООН

Дирекция Императорских театров имела право нарушить или приостановить действие контракта без каких-либо для себя последствий. Однако это могло случиться только *"в чрезвычайных обстоятельствах, как то: в случае пожара, наводнения, эпидемии, войны, возмущения, траура при Императорском Русском Дворе и других общественных бедствиях"*.

ЛИЧНОЕ ДЕЛО

Антонина Васильевна Нежданова *(1873—1950) — выдающаяся русская певица первой половины XX века. Гастролировала за рубежом, в 1913-м в Париже выступала в "Риголетто" (партия Джильды) вместе с Карузо и Руффо. Вела концертную деятельность.*

С 1936 года на педагогической работе (профессор Московской консерватории с 1943-го). Народная артистка СССР.

Бернард Шоу, ошеломленный исполнением Неждановой русских песен, подарил певице свой портрет с надписью: "Я понимаю теперь, почему природа дала мне возможность дожить до 70 лет — для того, чтобы я услышал лучшее из творений — Неждановой".

БЛИЦ

Довольны ли вы своим контрактом?

Этот вопрос "Народная воля" задала некоторым белорусским артистам.

Владимир ПЕТРОВ,
солист Национального академического Большого театра оперы Беларуси:

— С контрактами, которые мы сейчас имеем, артист легко попадает в кабалу. Хорошо, когда в театре умный руководитель, радеющий за свое дело и волнующийся за работников. Но если своенравный директор театра захочет расправиться с актером, то контракт ему в этом поможет. По окончании контракта работнику просто скажут "До свидания", не объясняя причин увольнения. Это ущемляет нашу свободу.

Каких-то особых правил по уходу в отпуск или на больничный у нас нет. Как и все смертные, мы берем за свой счет, если нужно куда-то уехать, и уходим на больничный, если заболеваем.

Я давно не перечитывал контракт, потому не могу сказать точно, прописаны ли там пункты относительно одежды артистов. Но лично я выхожу на сцену в своих туфлях. И даже носки приношу свои. Сегодня мы, артисты Национального академического театра, приносим на спектакли свою обувь, а завтра, быть может, понесем в театр и свои костюмы. И никого это почему-то не волнует...

Екатерина ОЛЕЙНИК,
артистка Национального академического Большого театра балета Беларуси:

— При устройстве на работу я подписала контракт, где описывалось, какие обязательства имею перед театром. Там были такие пункты, как требование не портить театральное имущество. Каких-то специфических моментов в наших контрактах нет.

Лично я чувствую себя в театре в безопасности по той простой причине, что работаю только второй год. А у нас есть закон, согласно которому молодого специалиста уволить не могут.

Игорь АРТАМОНОВ,
артист Национального академического Большого театра балета Беларуси:

— Контракты составлены у нас как положено. Но выполнение некоторых пунктов не соответствует тому, что написано...

Тамара МИРОНОВА,
артистка Республиканского театра Белорусской армии:

— Не могу назвать работающими контракты, которые работают в одну сторону. А у нас происходит именно так. В полноценных договорах с сотрудниками должны быть прописаны не только требования к ним, но и их права. Не только мы, но и дирекция театра тоже проигрывает из-за непродуманности контрактов. Их нужно от начала до конца заново разрабатывать. Особенно — театральные. Мы ведь не завод...

Благо я — успешная актриса, имеющая роли. Однако многие у нас страдают от нехватки работы. Поэтому очень не хватает в контракте пункта, согласно которому театр был бы обязан обеспечивать актера работой. В наших контрактах практически нет театральной специфики, которая отражала бы именно наш труд. Возможно, это и к лучшему. Ведь оценка театральной работы очень субъективна. И это может стать только очередной причиной споров.

Честно говоря, что я раньше была просто в штате, что сейчас я работаю по контракту — разницы не чувствую. Как были актеры бесправными, так и остались. Возможно, прежде чем вводить эту систему, нужно было взять пример с тех стран, где она существует уже давно и помогает урегулировать рабочие отношения, а не становится камнем преткновения...

Михаил ЗУЙ,
актер Национального академического театра имени Янки Купалы:

— Контрактная система дает возможность руководству уволить человека по субъективным причинам. Лично я не сталкивался с такой проблемой, но был свидетелем случаев, когда людей увольняли не из-за профессиональных качеств. Не всегда понятно, за что ты можешь впасть в немилость. То, что многие вещи в контракте можно трактовать поразному, лично мне не нравится.

Хотелось бы, чтобы были критерии, по которым человека могут уволить или применить взыскание. Сложно сказать, по каким параметрам актер сработал плохо. Считаю, театральное искусство сложно измерить и правильно оценить. Потому, наверное, и не нужно...

По большому счету, наверное, контракт — это хорошая штука, ознаменовывающая переход на какие-то рыночные отношения. Но мне кажется, форма и реализация этих контрактов у нас отнюдь не идеальна. Не могу сказать, что он меня как-то защищает. Одно только знаю — что буду работать в театре определенное контрактом время.

Ольга ПРУДНИКОВА.

СЛОВО ЭКСПЕРТУ

«Это государственное крепостничество...»

Леонид СУШКЕВИЧ, бывший председатель Центрального комитета Белорусского профсоюза работников культуры:

— Когда контрактная система только вводилась, наш комитет высказывал свое негативное отношение к ней. Несмотря на то, что правительство под давлением профсоюзов в 2004 году вносило в эту систему коррективы, до сих пор контракты вместе с вопросами об оплате труда работников культуры требуют усовершенствования. Ведь сегодня вместо предусмотренного контрактной системой увеличения тарифного оклада на 50% артисты в лучшем случае получают повышение на 1—5%. Нынешние контракты актеров не что иное, как государственное крепостничество. Хотя Министерство культуры должно находить средства для улучшения финансирования подведомственных ему учреждений.

Контракты прошлого века, в частности данный договор с певицей Неждановой, были более продуманными и выгодными для артистов. Все прописывалось до мельчайших подробностей, вплоть до шляпок исполнительницы. А сейчас музыкант театрального оркестра, чтобы его взяли на работу, должен принести свою скрипку и потом беречь ее, как зеницу ока, потому что на вторую он вряд ли заработает.

Рабочие заводов находятся в более выигрышном положении, нежели театральные актеры. На любом промышленном предприятии тарифная ставка первого разряда значительно выше положенной артистам тарифной ставки организаций бюджетной сферы. И эти "артистические" ставки повышаются не так легко и часто, как "заводские". Хотя при желании это можно было бы сделать. Ведь находятся средства на тот же "Славянский базар"...

АНОНС

У Мінск едзе Тар'я Турунен

Мы ўжо неяк звыкліся з тым, што ў Беларусь з гастролямі рэгулярна прыязджаюць ссівелыя і састарэлыя суперзоркі 80-х, у лепшым выпадку пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. З апошніх такіх "здабыткаў" — Томас Андэрс ды гурт Ace Of Base. Але цяпер у Мінск едзе сапраўдная, "дзеючая" музычная зорка — Тар'я Турунен. Адзіны канцэрт фінскай спявачкі адбудзецца 4 лістапада ў Палацы спорту.

Тар'я Турунен — адна з яркэйшых зорак у музычным свеце. У пэўным сэнсе яна феномен: ёй удалося дасягнуць аднолькава выдатных поспехаў як у рок-музыцы, так і на класічнай опернай сцэне. Яе цудоўнае мецца-сапрана зрабіла спявачку папулярнай не толькі ў роднай Фінляндыі, але і далёка за яе межамі. Беларускія ж рок-фанаты найлепш за ўсё ведаюць Тар'ю як салістку металічнага гурта Nightwish, якой яна была да канца 2005 года.

Тар'я Сойле Сюзанна Турунен нарадзілася 17 жніўня 1977 года ў горадзе Кітэ. Цяга да музыкі ў юнай Тар'і праявілася ў шэсць год — менавіта тады яна пачала вывучаць асновы оперных спеваў. Ужо ў 18 год Тар'я паступіла ў акадэмію імя славутага кампазітара Яна Сібеліуса ў мястэчку Куопіо. Адначасова з тым аднакласнік Тар'і — Туомас Халопайнен запрасіў маладую вакалістку ў свой новы акустычны праект. Так пачалася гісторыя знакамітага гурта Nightwish.

У той час Тар'я пачынае працаваць адначасова ў двух напрамках: першы — гэта гурт Nightwish, другі — Savonlinna Opera Festival Choir, у якой яна выконвала арыі Вагнера ды Вердзі. Так распачалася доўгая кар'ера Турунен, якая развівалася на грані стылістычных супярэчнасцяў, да таго часу, пакуль публіка не прызнала адзінства класікі ды металу.

Нягледзячы на паспяховы метал-гурт Nightwish, Тар'я не кінула займацца і сольнай творчасцю. Так, у 1999 годзе яна саліравала ў балетнай пастаноўцы Фінскага нацыянальнага Дома Оперы Evankeliumi.

У 2003 годзе выйшаў дакументальны фільм End Of Innocence, які распавядаў пра гісторыю гурта Nightwish. Гэты год быў паспяховы і асабіста для Тар'і — яна нарэшце выйшла замуж за свайго даўняга сябра, прадзюсера і менеджэра Марсэла Кабулі. Цырымонія праходзіла абсалютна без удзелу прэсы ў спецыяльна арандаваным замку ў Фінляндыі. Сярод запрошаных былі толькі самыя блізкія сужанцам людзі. Адразу пасля вяселля мадам Турунен і Марсэла Кабулі былі запрошаны да прэзідэнта Фінляндыі Тар'і Халонен і яе мужа ў госці ў прэзідэнцкі палац.

Пасля прэзідэнцкага прыёму Тар'я, дарэчы, атрымала ў сваёй краіне статус "Самай шыкоўна апранутай лэдзі".

А ў 2005 годзе скончыўся першы ў гісторыі гурта Nightwish двухгадовы сусветны Once Upon A World Tour, які стаў сапраўднай падзеяй, што ўзняла ўсю фінскую рок-музыку на якасна новы ўзровень. Скончылася турнэ грандыёзным канцэртам у фінскай зале Hartwall Arena (пазней там праходзіла "Еўрабачанне"). І тут здарылася нечаканае...

На наступны дзень пасля канцэрта ў Hartwall Arena, калі Тар'я ўжо ляцела ў самалёце, ёй нечакана ўрычылі ліст, падпісаны ўсімі музыкамі гурта. У лісце музыкі абвінавацілі Тар'ю ў "карысталюбстве ды грэбаванні інтарэсамі гурта" і паведамілі, што з гэтага моманту яна звольнена з калектыву.

Гэта быў цяжкі і нечаканы ўдар лёсу. Пазней Тар'я казала: *"Я спустошана. Я даведалася пра ўсё гэта ў дарозе, калі не магла адказаць. Я была звольнена з гурта, якому прысвяціла дзевяць гадоў свайго жыцця, і таму мне зараз вельмі сумна. Усё, што здарылася, жорстка ў адносінах на мяне, і перш за ўсё таму, што гэта адбылося публічна".*

Засмучаная і прыніжаная, але гордая і непераможная, Тар'я на некалькі тыдняў схавалася ад усіх у маёнтку мужа ў Буэнас-Айрэсе. А пасля, трохі апраўіўшыся ад шоку першых дзён, зноў узялася за музыку.

Але ўсё ж што адбылося тады? Чаму Тар'ю так нечакана і жорстка выгналі з гурта Nightwish? Як мне здаецца, тут трэба ўзгадаць, што па гараскопе Тар'я Турунен — класічная львіца. Рэзкая, уладарная, яна прывыкла аддаваць загады, а не падпарадкоўвацца ім, заўжды быць у цэнтры ўсеагульнай увагі, і пры тым гэта яскрава таленавіты і надзвычай працаздольны чалавек. "Пяшчотная" — гэта не пра яе. Таму і хлопцаў з Nightwish я магу зразумець.

Пасля тых падзей прайшло ўжо тры гады. Тар'я Турунен не знікае з тэлеэкранаў, опернай і рок-сцэны. Яна выпусціла ўжо два сольныя альбомы — вельмі паспяховыя, дарэчы, і пабывала ў некалькіх буйных турнэ. Яе кар'ера паспяхова працягваецца.

А што Nightwish? Хто што чуў пра гэты гурт пасля сыходу Тар'і? Ды амаль што ніхто і нічога. Музыкі, застаўшыся без вакалісткі, абвясцілі спецыяльны конкурс на замяшчэнне гэтай пасады. Але 35-гадовая шведка Анэт Олсан, якая ў ім перамагла, нават блізка не магла параўнацца з Тар'яй. У выніку гурт яшчэ існуе, але ў медыя-прасторы яго фактычна няма. Ягоныя кліпы не круцяць музычныя каналы, калектыў не запрашаюць на канцэрты і фестывалі.

Усё проста: паклоннікі не даравалі Nightwish абразу Тар'і.

І вось цяпер бліскучая Тар'я Турунен прыязджае ў Мінск.

Вітаем!

Віктар ДЗЯМІДАЎ.

БАМОНД

«Что здесь за фигня такая?», альбо Страсці па Шэкспіру

На мінулым тыдні ў сталічным Доме афіцэраў давалі Шэкспіра. Сусветна вядомы літоўскі рэжысёр Эймунтас Някрошус прывёз у Мінск спектакль "Атэла". Карэспандэнту "Народнай волі" ўдалося паглядзець пастаноўку.

Аб тым, што будзе аншлаг, я здагадваўся. Перад паходам на спектакль зазірнуў у інтэрнет, дзе азнаёміўся з уражаннямі расійскіх аматараў тэатра, якія апісвалі ажыятаж, што ўзнік у Маскве, калі Някрошус прывозіў туды свае спектаклі.

...Мінскія тэатралы, як высветлілася, зусім не горшыя за маскоўскіх. Ля ўваходу ў Дом афіцэраў публіка пачала збірацца прыкладна за гадзіну да пачатку тэатральнай дзеі. Сярод тых, хто прыйшоў дакрануцца да ўзвышанага, былі заўважаны вядомыя беларускія тэледзеячы — **Юрый Казіятка і Ягор Хрусталёў**. Там жа, на ганку Дома афіцэраў, стаяў дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы **Мікалай Кірычэнка**, які размаўляў па мабільным тэлефоне, напэўна, расказваючы, што спектакль Някрошуса яму пабачыць усё ж такі ўдасца...

Паглядзець Шэкспіра прыйшлі і прадстаўнікі мінскага офіса АБСЕ, а таксама амбасадары Літвы **Эдмінас Багдонас** і амбасадар Швецыі ў Беларусі **Стэфан Эрыксан**.

Упершыню ў жыцці я на ўласныя вочы бачыў людзей, якія трымалі ў руках таблічкі прыкладна такога зместу: **"Куплю білет на сённяшні спектакль. Кошт значэння не мае"**.

Людзей было настолькі многа, што, напэўна, натоўп можна было б западозрыць у правядзенні несанкцыянаванага мерапрыемства. Напэўна, бравыя супрацоўнікі Палка міліцыі спецыяльнага прызначэння менавіта так і расцанілі "зборышча" аматараў тэатральнага мастацтва. Клянуся, не хлушу. Стаю з дзяўчынай перад уваходам у Дом афіцэраў. Я паголены. Яна з ружай. Нічога супрацьзаконнага, зразумела, не робім. Падыходзяць двое ў форме: "Э, алё, это, что здесь за фигня такая происходит?" Я, вытрымаўшы амаль тэатральную паўзу, адказваю: "Дык Шэкспіра даюць жа, аншлаг тут!" Людзі ў форме сыходзяць, не развітваючыся. Бачу ў вачах дзяўчыны, якая далёкая ад палітыкі і пра разгон дэманстрантаў не ведае, шчырае здзіўленне... Можа быць, міліцыянераў засмуціла тое, што "Атэла " ішоў за два дні да выбараў, а можа, ім проста не хапіла квіткоў на спектакль...

Дарэчы, нават і тых, каму хапіла квіткоў, чакала яшчэ адна неспадзяванка. Справа ў тым, што спектакль ішоў на прыгожай літоўскай мове, аднак навушнікаў для сінхроннага перакладу хапіла далёка не ўсім. Але людзі не спяшаліся пакідаць Дом афіцэраў у антракце, бо класіка зразумелая на ўсіх мовах свету...

Між іншым, як паабяцаў старшыня праўлення "Белгазпрамбанка" **Віктар Бабарыка** (бадай што самы вядомы тэатрал сярод сталічных банкіраў і фінансістаў), з падачы якога ў Мінску і адбыліся Шэкспіраўскія дні, у наступным сезоне нешта падобнае чакае мінскіх тэатралаў зноў...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

Віктар ГАНЧАРЭНКА:
«Гуляць на “Дынама” не падабаецца»

Напярэдадні першага хатняга матча барысаўскага БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў супраць італьянскага "Ювентуса" галоўны трэнер беларускай каманды Віктар Ганчарэнка адказаў на пытанні журналістаў.

На вялікі жаль, графік падпісання нумара ў друк робіць бессэнсоўным паведамляць пра тое, як барысаўская каманда рыхтавалася да матча з вядомым італьянскім клубам. Таму засяродзім увагу на іншых адказах Віктара Ганчарэнкі.

— Віктар Міхайлавіч, усім вядомыя жорсткія патрабаванні УЕФА да арэн, на якіх праходзяць матчы Лігі чэмпіёнаў. У гэтай сувязі хацелася б пацікавіцца, як вы ставіцеся да правядзення матча на "Дынама"?

— Скажу шчыра, на "Дынама" нам гуляць не падабаецца. Не падабаецца ў першую чаргу з-за якасці сталічнага поля. Яно вельмі "цяжкае". Гуляючы на дынамаўскім газоне, футбалісты аддаюць вельмі многа "лішніх" сіл. Па-другое, гэта арэна нашага прамога канкурэнта, хаця ў Лізе чэмпіёнаў — гэта наша хатняя арэна. Можа быць, мая ацэнка падасца катэгарычнай, але я параўноўваю "Дынама" з утульным барысаўскім стадыёнам, дзе выдатны газон. Дарэчы, менавіта ў Барысаве мы і рыхтаваліся да сустрэчы з італьянцамі.

— Поспех БАТЭ — гэта першае гучнае дасягненне суверэннага беларускага футбола. На ваш погляд, якімі фактарамі ён абумоўлены. Выступленне БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў — гэта поспех асобна ўзятай каманды ці крок наперад усяго беларускага футбола?

— Пакажа час. Што да поспеху БАТЭ, то тут, напэўна, супалі адразу некалькі фактараў. Па-першае, жараб'ёўка. Па-другое, менавіта на рашаючыя гульні павінен "прыпасці" пік спартыўнай формы футбалістаў. Па-трэцяе, вязенне. Шчыра кажучы, на маю думку, поспех БАТЭ абумоўлены адным простым фактарам — у нас вельмі добрая працавітая каманда. Хочацца верыць, што выхад БАТЭ ў групавы этап Лігі чэмпіёнаў сведчыць аб тым, што ўзровень усяго айчыннага футбола расце.

— Напэўна, пасля першай гульні з іспанскім "Рэалам" некаторымі футбалістамі беларускай каманды зацікавіліся футбольныя агенты. Можа быць, у кагосьці з барысаўскіх футбалістаў ужо ёсць канкрэтныя прапановы аб працягненні кар'еры за межамі краіны?

— Не толькі пасля матча з "Рэалам" да нашых футбалістаў узнікла цікавасць. Падобнае назіралася і пасля матчаў кваліфікацыйнага раунда. Цікавяцца многімі хлопцамі — тэлефануюць і мне, і ў клуб, аднак пра нешта канкрэтнае зараз сказаць цяжка. Давайце дачакаемся завяршэння сезона. Не трэба зараз чапаць футбалістаў.

— "Рэал" — пакуль што самы моцны сапернік у гісторыі БАТЭ. Віктар Міхайлавіч, ці адчулі вы ў гульні з іспанцамі, што ў футбалістаў дабавілася ўпэўненасці ва ўласных сілах?

— Пасля таго, як мае падначаленыя адчулі на сабе, што такое супрацьстаянне з іспанскім "Рэалам", ім стала лягчэй даносіць тэзісы пра патрабаванні сучаснага футбола. Яны ўпэўніліся, што самы хуткі на футбольным полі не канкрэтны футбаліст, а мяч. Як вынік — буйная перамога над салігорскім "Шахцёрам" у матчы чэмпіянату Беларусі. *(Барысаўчане перамаглі з лікам 5:0. — Аўт.)*

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фото gazetaby.com

«Шыннік» трапіў у аварыю

28 верасня аўтобус, у якім хакеісты бабруйскага "Шынніка" накіроўваліся на чарговы матч адкрытага чэмпіянату Беларусі ў латвійскі Огрэ, трапіў у аварыю. ДТЗ адбылося на 34-м кіламетры дарогі Мінск—Гомель.

Па словах супрацоўнікаў Пухавіцкай ДАІ, якія выязджалі на месца здарэння, прычынай аварыі стаў сабака, які выбег на праезную частку. Кіроўца, спрабуючы пазбегнуць наезду на яго, не справіўся з кіраваннем, і аўтобус вылецеў у кювет, перакуліўшыся на бок.

Сур'ёзна пацярпелы ў гэтым інцыдэнце адзін — нападаючы "Шынніка" Кірыл Брыкун, у якога рваная рана калена. Астатнія ігракі пацярпелі значна менш. Аднак, улічваючы шокавы стан падапечных, трэнерскі штаб "Шынніка" пастанавіў вярнуцца ў Бабруйск і апавясціў пра гэта федэрацыю хакея. Такім чынам, матч АСК-"Огрэ" — "Шыннік" перанесены.

Вячаслаў ХАРАНЕКА:
«Я не прыгажун, затое абаяльны...»

Беларускі "кароль гір", аўтар шматлікіх сілавых рэкордаў Вячаслаў Харанека быў вымушаны з'ехаць у Францыю, каб пацалаваць Ірыну Дарафееву...



З радзільнага дома — у морг

Мала хто ведае, што з самага дзяцінства Вячаслаў Харанека марыў быць акцёрам. "Касманаўтам быць не хацелася, хаця ў гады майго дзяцінства гэта было вельмі модна, — прызнаецца ён. — У маладосці ў тэатральны інстытут паступаць не адважыўся, выбраў заняткі спортам, дасягнуў пэўных вынікаў... Праўда, бацькі не вельмі ўхвалялі маё захапленне гірамі, казалі, што ўсё гэта несур'ёзна... Аднак у жыцці я вельмі ўпарты чалавек, са шляху мяне не збіць, асабліва калі я вызначыў мэту, да якой трэба дайсці".

Узышоўшы на спартыўны алімп (128 сусветных рэкордаў Харанекі ў гіравым спорце будуць пабіты не хутка), Вячаслаў вырашыў рэалізавацца як акцёр. "Мой першы акцёрскі вопыт — удзел у рэаліці-шоу АНТ "Зорны цырк", — працягвае Вячаслаў. — Там мяне заўважыў рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў, які параіў зайсці на "Беларусьфільм", з тым каб на мяне там "завялі справу". Прыйшоў, сфатаграфаваўся і ўжо амаль забыўся пра тое, што хадзіў туды... І тут як гром сярод яснага неба — раздаецца званок. Тэлефанавалі якраз-такі з "Беларусьфільма", сказалі, каб пад'ехаў..."

Першая сур'ёзная роля Вячаслава ў кіно — камандзір спецпадраздзялення "Тыгр". "Зараз у Беларусі завяршаюцца здымкі 16-серыйнага фільма "Рэйдэры", — расказвае Харанека. — Гэтае кіно здымаецца па заказе расійскай тэлекампаніі НТБ. Ведаеце, я калі быў на "Беларусьфільме" ўпершыню, адразу паведаміў, што ў масоўцы здымацца не буду — не хлопчык ужо. Хацеў ролю са словамі... Ужывацца ў вобраз камандзіра спецпадраздзялення доўга не прыйшлося. Усё ж такі дапамагла атлетычная падрыхтоўка. Адзінае, што мне "ставілі" голас. Рэжысёры настойвалі, каб ён у мяне быў "грубым", як у капітана Жэглова з вядомага савецкага тэлефільма".

Сцэны з удзелам Харанекі здымаліся ў тым ліку — у радзільным доме і ў... моргу. "Больш спадабалася, канечне, у радзільным доме, — прызнаецца Вячаслаў. — Будучыя мамы пазнавалі мяне, аўтографы прасілі. Што да здымак у моргу, то і там асабліва страшна не было. Баяцца жывых трэба, а не мёртвых. Знаёмыя, даведаўшыся, што мяне будуць здымаць у моргу, папярэджвалі: маўляў, там паветра іншае, пах своеасаблівы. Аднак нічога своеасаблівага я так і не заўважыў, толькі што цішыня нейкая звонкая там..."

Дададзім, што на экраны серыял "Рэйдэры" з удзелам беларускага "караля гір" выйдзе ў наступным годзе.

Незабыўны пацалунак

Але яшчэ да здымак у серыяле Вячаслаў Харанека здолеў пабываць у Францыі. "Ёсць такі цудоўны выраз "Пабачыць Парыж і памерці", — гаворыць Вячаслаў. — Парыж убачыць не давялося, а вось калі не памерці, дык траўміравацца ў паядынку з быком я мог запраста".

Справа ў тым, што Харанека прыняў удзел у яшчэ адным шоу, якое зараз ідзе ў эфіры тэлеканала АНТ "Битва городов". "Здымкі адбываліся пад Канамі, — расказвае Харанека. — Усіх удзельнікаў праекта ў Францыю завезлі на аўтобусах. Мы патрэніраваліся некалькі дзён і кінуліся ў бой. Што ўразіла? Уразіла супрацьстаянне з быком. Дарэчы, у здымках удзельнічаюць не абы-якія, а "спецыяльна выгадаваныя" быкі. Іх гадуюць недзе ў Іспаніі, а пасля транспартуюць у Францыю. Калі я выходзіў на арэну супрацьстаяць быку, то мяне адразу папярэдзілі — рукамі чапаць жывёліну нельга. Здаецца, у мінулым годзе на здымках расійскай версіі гэтага праекта вядомы расійскі "тэрмінатар" Уладзімір Турчынскі схапіў быка за рогі ды і ўдарыў яму паміж вачэй... Бык выжыў, але Турчынскага дыскваліфікавалі...

Асабіста ў мяне з быком адносіны склаліся не вельмі, пару разоў жывёліна мяне "зачапіла". Аднак сур'ёзнай траўмы ўдалося пазбегнуць".

Усе ўдзельнікі "Битвы городов" разбіты па прыналежнасці да абласных гарадоў. Харанека выступае за каманду Магілёўскай вобласці: "Разам са мной за Магілёўшчыну выступала Ірына Дарафеева. Усе аповеды пра тое, што ў спявачкі нібыта развіваецца "зорная хвароба" — лухта. Іра вельмі добры чалавек — камандны баец. Ці падтрымліваў я яе? Я разумею, што не прыгажун, затое абаяльны. Тым не менш Дарафееву я цалаваў — у шчаку. У мяне прынцып: у вусны цалую жанчыну, калі думаю аб сур'ёзных адносінах. Дык вось, жанчына ўвогуле створана для пацалункаў, але ў вусны цалую толькі ўласную жонку..."

Між іншым, у планах беларускага асілка — усталяванне новых сілавых рэкордаў. Не выключана, што адзін з іх будзе прысвечаны Ірыне Дарафеевай...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЗНАЁМЦЕСЯ

У мінскага «Дынама» — новы трэнер

55-гадовы сербскі футбольны спецыяліст Славалюб Муслін падпісаў двухгадовы кантракт з мінскім "Дынама". Да працы ён прыступіў 26 верасня, паведаміла прэс-служба "Дынама".

Славалюб Муслін змяніў Ігара Крывушэнку, які займаў пасаду галоўнага трэнера з лістапада 2007 года і меў трохгадовы кантракт.

З прызначэннем Мусліна адбылася амаль дэтэктыўная гісторыя. 14 верасня серб прысутнічаў на матчы "Тарпеда" (Жодзіна) — "Дынама" (Мінск). 18 верасня расійскія спартыўныя сайты паведамілі, што С.Муслін заключыў з "Дынама" двухгадовы кантракт, а І.Крывушэнка звольнены за "сціплыя вынікі". Гэтую інфармацыю, аднак, абвергнуў прэс-аташэ "Дынама" Алег Сабалеўскі: *"Галоўным трэнерам з'яўляецца Ігар Крывушэнка, які рыхтуе каманду да наступнага матча чэмпіянату".*

Апошнія тры сустрэчы пад кіраўніцтвам І.Крывушэнкі "Дынама" выйграла (25 верасня — у гродзенскага "Нёмана") і цяпер займае трэцяе месца ў турнірнай табліцы. Аднак каманда няўдала выступіла ў Кубку Беларусі: у красавіку прайграла ў паўфінале розыгрышу-2007/2008, а ў верасні — у 1/16 фіналу розыгрышу-2008/2009.

"Мая задача — пастарацца зрабіць усё, каб брэнд "Дынама" зноў загучаў і каманда зноў стала тварам беларускага футболу", — заявіў І.Крывушэнка 22 снежня мінулага года на першай прэс-канферэнцыі ў якасці галоўнага трэнера "Дынама", куды ён перайшоў з барысаўскага БАТЭ, якое двойчы прыводзіў да чэмпіёнскага тытулу.

У прыватнасці, перад "Дынама" была пастаўлена задача праз Кубак Беларусі выйсці ў Кубак УЕФА. Аднак каманда ў еўракубкі не трапіла. На той жа прэс-канферэнцыі І.Крывушэнка заявіў, што яго не хвалюе магчымасць хуткай адстаўкі: "Ідучы сюды, я не баяўся. Калі думаць пра дрэннае, яно здзейсніцца".

Серб Славалюб Муслін нарадзіўся 15 чэрвеня 1953 года ў югаслаўскім горадзе Крагуевац. Выступаў за ОФК, БАСК, "Рад". У 1974 годзе перайшоў у "Црвену Звезду", дзе гуляў на працягу сямі гадоў і тройчы станавіўся чэмпіёнам краіны. У 1979 годзе выйшаў у фінал Кубка УЕФА. З 1981-га па 1986 год выступаў у Францыі за "Ліль" і "Брэст". Правёў сем матчаў за зборную Югаславіі.

Трэнерскую кар'еру пачаў у "Брэсце" ў якасці другога трэнера, а ў 1988 годзе ўзначаліў клуб. Пад кіраўніцтвам югаслава "Брэст" вярнуўся ў вышэйшы дывізіён, але ў 1992 годзе быў паніжаны ў класе ў сувязі з банкруцтвам.

Пасля трохгадовай працы з французскім клубам трэцяга дывізіёна "По" С.Муслін у 1995 годзе стаў галоўным трэнерам "Бардо", затым працаваў з "Ле Манам" і "Лансам". У 1997 годзе французскі этап яго кар'еры падышоў да канца.

Далей была непрацяглая камандзіроўка ў мараканскі клуб "Раджа Касабланка" і вяртанне на радзіму, дзе серб узначаліў бялградскую "Црвену Звезду". З гэтым клубам С.Муслін тройчы выйграваў чэмпіянат краіны (2000, 2001, 2004) і двойчы — нацыянальны Кубак (2000, 2004).

У сакавіку 2002 года настаўнік перайшоў у сафійскі "Леўскі", які прывёў да перамогі ў чэмпіянаце і Кубку Балгарыі, пасля чаго зноў вярнуўся ў "Црвену Звезду".

У сезоне-2004/2005 С.Муслін працаваў у данецкім "Металургу" і прывёў каманду да бронзавых медалёў чэмпіянату Украіны. З-за рознагалоссяў з кіраўніцтвам ён пакінуў клуб і паехаў у бельгійскі "Локерэн", адкуль атрымаў запрашэнне ў маскоўскі "Лакаматыў". Пад яго кіраўніцтвам чыгуначнікі выдалі серыю з 18 матчаў без паражэнняў. Наступным клубам С.Мусліна зноў стаў "Локерэн". Летам 2007 года серб выратаваў ад вылету з прэм'ер-лігі падмаскоўныя "Хімкі". Вясной 2008 года С.Муслін развітаўся з камандай. У мінскім "Дынама" С.Муслін стаў 18-м трэнерам за апошнія восем гадоў.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

Сапраўдны прафесіянал — сціплы

У артыкуле "Як "злосны" Коўбан рыхтаваў алімпійцаў" ("Народная воля" 19 верасня бягучага года) дапушчана недакладнасць.

Замест напісанага ў апошнім абзацы "за час сваёй працы ў вялікім спорце Коўбан падрыхтаваў дзесяць алімпійскіх чэмпіёнаў" трэба ўдакладніць, што насамрэч найвышэйшая эфектыўнасць арганізацыі працы ў РВАР, дзе Коўбан працаваў намеснікам дырэктара па спорце, праявілася на Алімпійскіх гульнях у Сеуле і Барселоне, дзе 10 выпускнікоў вучылішча сталі алімпійскімі чэмпіёнамі.

Сутнасць удакладнення ў тым, што заслужаны трэнер Беларусі Яўген Сяргеевіч Коўбан рыхтаваў будучых алімпійскіх чэмпіёнаў не асабіста. Праўда, менавіта падчас яго знаходжання на пасадзе намесніка дырэктара Рэспубліканскага вучылішча алімпійскага рэзерву дасягнула такога вялікага поспеху.

На гэтую акалічнасць звярнуў увагу сам герой публікацыі. "Я ж асабіста не рыхтаваў алімпійскіх чэмпіёнаў, проста яны выхоўваліся ў РВАР, калі я там працаваў. Прымазвацца да чужой славы я не прывык", — адзначыў Яўген Сяргеевіч.

А заслугамі Яўгена Сяргеевіча Коўбана як трэнера з'яўляецца тое, што 16 выпускнікоў вучылішча, з якімі ён займаўся асабіста, сталі майстрамі спорту, а дваім (Сяргею Каснаускасу і Васілю Капцюху) прысвоена званне "заслужаны майстар спорту".

ШАШКІ

Бліц-57

Пачынаем яго заданнем № 1 — мініяцюрай нашага падпісчыка з Мінска Віктара Шульгі:

Белыя: b6, c7, d4, e3, f4, g3 (6).

Чорныя: a5, b2, c3, f6, g7, h2 (6).

Выйгрыш.

Пераможца конкурсу будзе заахвочаны. Чакаем адказы па адресе: **220030, Мінск, вул. Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", рубрыка "Шашкі".**

Па-за конкурсам пазнаёмцеся і з такімі задумкамі В.Шульгі на 64-клетачнай дошцы:

1.**Белыя:** a5, b4, c3, c5, d2, h4, h6 (7). **Чорныя:** a3, a7, d6, e3, e7, f4, f6, h8 (8).

2.**Белыя:** a5, b4, b6, c5, e5, f4, f6, g7, h6 (9). **Чорныя:** b2, b8, c7, d8, e7, f2, h2, h8 (8).

3.**Белыя:** a5, b2, b4, d2, e1, g3, g7, h6 (8). **Чорныя:** a7, b8, d4, e3, e5, f4, f6, h2, h8 (9).

Супастаўце свае развязкі з аўтарскімі: **N1.** D4, e5, g3, f4, d8 (d4) f6 (e3) hg7 (f2), d8, e1x; **N2.** F8, hg7, e7, a3, c7, c5, g1x; **N3.** Bc3 (b2) f8, d2, bc5, c7, d8, g7, e3x. Таксама будзем рады вашым параўнанням.

В.Шульга — старшыня Рэспубліканскай камісіі па шашачнай кампазіцыі, змястоўна і своеасабліва вядзе рубрыку "Шашкі" ў газетах "Культура" і дзіцячай "Зорьке". А нядаўна ён атрымаў дыплом аб прысваенні яму першаму з беларускіх праблемістаў звання майстра ФМЖД.

Жамчужыны на дошцы

Аб выніках міжнароднага конкурсу памяці беларускага майстра задачнага мастацтва Гары Далідовіча мы паведамлялі раней. Тады (8 і 22 жніўня) прывялі жамчужаны на 100-клетачнай дошцы майстра Аляксандра Сапегіна з Мсціслаўскага раёна (1-ы прыз у катэгорыі В), нашага земляка з Масквы міжнароднага гросмайстра Уладзіміра Матуса (1-ы прыз у катэгорыі С, 2-гі і 6-ы — у катэгорыі В), майстроў з Мінска Барыса Іванова (3-ці ў катэгорыі С), Анатоля Шабаліна (4-ы ў катэгорыі А). У катэгорыі ж А перамог С. Беранштэйн (Германія).





Сёння працягваем публікацыю твораў нашых суайчыннікаў, якія ўвайшлі ў дзесятку лепшых:

1 (У.Матус). **Белыя:** 19, 23, 24, 25, 26, 29, 31, 41, 43, 46, 47, 48 (12). **Чорныя:** 3, 7, 8, 10, 13, 14, 17, 22, 28, 32, 38, 40, 45 (13). 9-е месца ў катэгорыі С: 21, 48-42, 37, 34, 9, 5, 50х.

2 (Мікалай Крышталь, Пінск). **Белыя:** 11, 17, 21, 22, 27, 31, 40, 42, 44, 48, 49, 50 (12). **Чорныя:** 6, 9, 14, 19, 25, 26, 29, 33, 34, 35, 36, 37, 45 (13). 10-е месца ў той жа катэгорыі: 48-42, 12, 43, 38, 4, 30, 27-22, 50х.

3 (Мікалай Зайцаў, Баранавічы). **Белыя:** 12, 21, 27, 40, 48, дамкі 22, 25, 36, 44, 45 (10). **Чорныя:** 16, 35, 37, 42, дамкі 4, 38 (6). 7-е месца ў катэгорыі А: 22-33 (1А) 41, 25-34, 44-50, 36, 41#. А(7) 25-39, 1, 22, 46, 42, 32, 49#.

4 (М. Зайцаў). **Белыя:** 37, 41, 44, 48, дамкі 31, 34, 36, 40, 45, 47 (10). **Чорныя:** 11, 17, 21, 28, 38, 42, дамкі 1, 14 (8). 9-е месца ў той жа катэгорыі: 26, 22 (28А) 35, 38, 19, 32, 41, 37#. А(46) 22-18, 32, 22, 33, 44, 39#.

Астатнія задумкі беларусаў занялі месцы: у намінацыі А — мінчан І.Наўроцкага і Б.Іванова, А.Шурпіна з Клімавічаў, М.Бабруйніка з Бабруйска, М.Крышталя і А.Шабаліна (10—37-е); у намінацыі В — В.Грабенкі з Мінска (13—14-е), М.Цветава, зараз выступае за Ізраіль (18-е і 36—69-е), А.Кагоцькі з Пінска (30-е), Л.Вітошкіна з Гомеля (33-е), В.Малашэнкі (35-е і 36—69-е), М.Вяргейчыка з Гомеля, Б.Іванова і А.Сапегіна (36—69-е); у намінацыі С — М.Цветава (12—13-е), М.Вяргейчыка (14-е), Б.Іванова, В.Малашэнкі, І. Наўроцкага і А.Сапегіна (18—37-е).

У мемарыяле ўзялі ўдзел складальнікі з Расіі, Германіі, Украіны, Узбекістана, Францыі, Нідэрландаў, ЗША, Ізраіля, Літвы і Беларусі. Яны (71 аўтар) прадставілі на конкурс 142 твора (!). А абслугоўвалі яго суддзі Я.Бюс (Германія), Е.Зубаў (Расія), М.Грушэўскі і Д.Сухарукаў, суддзя-каардынатар В.Шульга і самы актыўны суддзя-кансультант П.Шклудаў (Беларусь).

Самаправерка

Давайце яе зробім на наступных заданнях.

Бліц-56/6 (К. Барэль—Я. Кандрачэнка): (fg5) h:f6 (e:c1) ef6 (de7!) f:b6 (a:e3)х.

"Нізка кампазіцый" (М. Стэфановіч): **№5.** 1. bc3 2. cb8 3. b:a3 4. a:g1#.

У бліцах-54 і 55 стартавалі У.Дубатоўка, Я.Казлоў, Анжаліка Кашкан, Марыя Лічко, Д.Мамедаў, А. і А.Яраховічы (Уздзенскі раён), Л.Жыхар (Мядзел), А.Чумакоў (Светлагорск), І.Працук (Паставы), І.Ананіч (Гродна), Б.Завадскі (Брэст), А.Перавознікаў і У.Сапяжынскі (Рагачоў), І.Шэмет (Ваўкавыск), В.Астрынскі, В.Рубінчык, А.Сняжкоў і В.Шульга (Мінск), А.Янчук (Камянец), А.Белы, В. і Р.Мурашкі і М.Падбрэзскі (Наваполацк), Аляксандра Камінская (Вілейка) і іншыя.

Першы з іх выйграў Анатоль Чумакоў, другі — Браніслаў Завадскі. Ім высылаецца кніга У.Агафонава "Камбінацыя. Міжнародныя шашкі" (з прызавога фонду нашага шчодрага чытача і аўтара Пятра Шклудава з Наваполацка).

Мікалай ГЛАДКІ.

ШАХМАТЫ

Из творчества читателей
А.Азов

Белые: Крg8, Фс8, Ла7, п. f5 (4).

Черные: Кре7, Cd8, п. d7 (3).

Мат в 2 хода.

Предлагаем вниманию любителей шахматной композиции двухходовую задачу-миниатюру гомельчанина Алексея Азова. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**



Шахматная элита

В рейтинг-листе Международной шахматной федерации (ФИДЕ) особо выделены 100 сильнейших шахматистов мира. Список возглавляет действующий чемпион мира Вишванатан Ананд (Индия) — 2798. Вторую и третью строчки делят россияне гроссмейстер Александр Морозевич и экс-чемпион мира Владимир Крамник — по 2788. В число 40 сильнейших также входят: 4.Василий Иванчук (Украина) — 2781, 5.экс-чемпион мира Веселин Топалов (Болгария) — 2777, 6.Магнус Карлсен (Норвегия) — 2775, 7.Теймур Раджабов — 2744, 8.Шахриар Мамедьяров — 2742 (оба из Азербайджана), 9.Алексей Широв (Испания) — 2741, 10.Петр Леко (Венгрия) — 2741, 11.Петр Свидлер (Россия) — 2738, 12.Левон Аронян (Армения) — 2737, 13.Майкл Адамс (Англия) — 2735, 14.Александр Грищук (Россия) — 2728, 15.Сергей Карякин (Украина) — 2727, 16.Сергей Мовсесян (Словакия) — 2723, 17.обладатель Кубка мира Гата Камский (США) — 2723, 18.Борис Гельфанд (Израиль) — 2720, 19.экс-чемпион мира ФИДЕ Руслан Пономарев (Украина) — 2718, 20.Вугар Гашимов (Азербайджан) — 2717, 21.Павел Эльянов (Украина) — 2716, 22.сильнейшая в мире шахматистка Юдит Полгар (Венгрия) — 2711, 23.Бу Сянчжи (Китай) — 2710, 24.Дмитрий Яковенко (Россия) — 2709, 25.Ленье Домингес (Куба) — 2708, 26.Евгений Алексеев (Россия) — 2708, 27.Ки Хуа (Китай) — 2705, 28.Вадим Милов (Швейцария) — 2705, 29.Ван Юэ (Китай) — 2704, 30.Сергей Рублевский (Россия) — 2699, 31.Хикару Накамура (США) — 2697, 32.Ливиу-Дитер Нисипяну (Румыния) — 2692, 33.Этьен Бакро (Франция) — 2691, 34.Ван Хао (Китай) — 2691, 35.Владимир Малахов (Россия) — 2689, 36.Иван Чепаринов (Болгария) — 2687, 37.Виктор Бологан (Молдова) — 2686, 38.Кришнан Сашикирян (Индия) — 2684, 39.Максим Вашье-Лаграв (Франция) — 2681, 40.Михаил Ройз (Израиль) — 2680.

В сильнейшей первой сотне больше всего представителей России — 25, Украины — 8, Израиля — 6. По 4 гроссмейстера из Индии, Азербайджана, Венгрии, США, Китая и Франции, по 3 — от Болгарии, Армении, Германии, по 2 — от Испании, Англии, Румынии, Боснии, Голландии и Казахстана. Еще 16 стран представлены одним гроссмейстером. К сожалению, наших шахматистов в престижной сотые сейчас нет.

21 претендент

Международная шахматная федерация проводит в 2008—2009 годах первый розыгрыш Гран-при. Всего состоится 6 турниров, по три в каждом году. К участию в розыгрыше Гран-при приглашен 21 гроссмейстер, каждому из них предстоит выступить в четырех турнирах. Уже прошли турниры в Баку и Сочи. В первом из них, проходившем в столице Азербайджана, победителем стал бакинец Вугар Гашимов, набравший в 13 встречах 8 очков. Такой же результат показали Ван Юэ (Китай) и Магнус Карлсен (Норвегия), разделившие с победителем 1—3-е места. За ними следуют: 4-5.Шахриар Мамедьяров и Александр Грищук — по 7,5, 6-7.Майкл Адамс и Петр Свидлер — по 6,5, 8-10.Теймур Раджабов, Гата Камский и Сергей Карякин — по 6 очков, 11-12. Иван Чепаринов и Давид Навара (Чехия) — по 5,5, 13-14.Этьен Бакро и Эрнесто Инаркиев (Россия) — по 5 очков.

Второй турнир серии Гран-при прошел в Сочи. Здесь победу одержал Левон Аронян — 8,5 из 13. Вторым на финише был Теймур Раджабов, отставший от победителя на пол-очка. На последующих местах: 3-4.Ван Юэ и Гата Камский — по 7,5, 5-7.Сергей Карякин, Дмитрий Яковенко и Петр Свидлер — по 7, 8-9.Василий Иванчук и Вугар Гашимов — по 6,5, 10-11.Иван Чепаринов и Александр Грищук — по 6, 12.Борис Гельфанд — 5,5, 13-14.Аль Медейхи (Катар) и Давид Навара (Чехия) — по 4 очка.

Победа Алексея Александрова

В старинном русском городе Владимире прошел международный шахматный турнир. Блестяще выступил в нем белорусский гроссмейстер Алексей Александров. Минчанин в 10 встречах набрал 8,5 очка и на полтора очка опередил ближайших конкурентов российских гроссмейстеров Евгения Шапошникова и Дмитрия Кокорева. Турнир одновременно являлся этапом розыгрыша Кубка России. По его итогам Александров получил право выступить в финале соревнований.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА “Типография Михайлова - С”, 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА “Типография Михайлова”, 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 01.10.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №